**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за май 2021 г.

**<u>Мерапрыемствы да Дня Перамогі, Дня Дзяржаўнага сцяга РБ</u>**

**У мае стартаваў бібліямарафон патрыятычных мерапрыемтваў «Великим огненным годам святую память сохраняя», у рамках якога праведзены мерапрыемтва для розных катэгорый карыстальнікаў.**

**7 мая**

У бібліятэцы прайшла літаратурна-патрыятычная кампазіцыя «Войны священные страницы». Дзеці прагледзелі мультымедыйную прэзентацыю па кнізе В. Катаева «Сын полка», прынялі ўдзел у віктарыне «О войне мы узнаем из книг», праслухалі агляд кніжнай выставы «Праз вайну, праз памяць, праз лёс». Аўтарскія вершы на ваенную тэматыку чытала член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Н. Момлік. Упрыгажэннем мерапрыемства сталі песні ў выкананні А. Балка, Н. Пушыла, А. Сарока, О. Сыч.

Дзівінскі філіял, 27 чал.

**9 мая**

Бібліятэкары цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у песенным флэшмобе ў рамках мітынгу, прысвечаным 76-м угодкам Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Са шчырым натхненнем падхаплялі жыхары горада, якія прыйшлі ў сквер Марозава, лепшыя мелодыі ваенных гадоў. Святочны настрой дарылі гараджанам у выкананні работнікоў бібліятэкі і школы мастацтваў «Смуглянка», «Венский вальс», «Тёмная ночь», «День Победы»і шмат якія іншыя песні.

*(Пашкович, Л. Особого праздничного настроения… / Л. Пашкович // Кобрынскі веснік. – 2021. – 15 мая. – С. 2.*

**12 мая**

На сустрэчы пакаленняў «Час ідзе, памяць застаецца» прагучалі ўспаміны пра загінуўшых абаронцаў Радзімы, вершы і песні ваенных гадоў. Лепшыя чытачы кніг пра вайну ўзнагароджаны дыпломамі. На выставе «И подвиг, и память, и боль на века» прадстаўлены матэрыялы пра вязняў і загінуўшых абаронцаў вёскі.

Акцябрьская, 26 чал.

**12 мая**

Падчас правядзення дня ваенна-патрыятычнай кнігі «В сердцах и книгах память о войне» старэйшае пакаленне мясцовых жыхароў успамінала аднавяскоўцаў-ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў фотастэнда «Они сражались за Родину». Іх увазе прадстаўлена кніга «Памяць», а таксама

матэрыялы краязнаўчага кутка пра дзейнасць партызанскіх атрадаў і іх удзельнікаў-землякоў. Падрыхтавана тэматычная кніжная выстава «Литература великого подвига».

Юныя ўдзельнікі дэкламавалі вершы са зборніка беларускіх паэтаў «Нам не трэба вайны!», услых чыталі расказ У. Кудлачева «Война глазами ребенка». Пранікнёна прагучала «Клятва Марата Казея» з дзіцячых вуснаў. Цікавасць у маладых выклікаў расказ Т. В. Скрабнёвай пра лёс сваяка, які патрапіў на фронт 15-гадовым юнаком і прайшоў усю вайну.

Для старшакласнікаў праведзена віктарына па мастацкіх творах пра Вялікую Айчынную вайну «Что мы знаем о войне?».

Верхалеская ПБ, 45 чал.

**13 мая**

Гасцямі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Нас песня к Победе вела», прысвечанай 80-годдзю з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны 1941 - 1945 гадоў сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Вядучыя расказалі дзецям пра гісторыю стварэння песень Вялікай Айчыннай вайны. У выкананні вакальнай групы цэнтральнай раённай бібліятэкі «Фантазія» гучалі песні ваенных гадоў: «Катюша», «В землянке», «Смуглянка», «Журавли», «Алеша» і інш. Гледачы не змаглі ўтрымацца і падпявалі бібліятэкарам.

*(Прокопук, Ю. Песни Великой Победы / Ю. Прокопук // Кобрин-информ. – 2021. – 20 мая. – С. 19).*

*ЦБ, 30 чал.*

**20 мая**

Бібліятэкар правяла дзень франтавой паэзіі «Они остались юными навек». Расказала пра подзвігі піянераў-герояў у гады Вялікай Айчыннай вайны, пра землякоў, чый подзвіг навекі застанецца ў памяці пакаленняў, правяла агляд кніжнай выставы «Маленькие герои большой войны» і ўручыла буклеты «Запомни героя в лицо». Відэапрэзентацыя «Юные герои» распавяла школьнікам пра гераічнасць Лёні Голікава, Зіны Партновай, Марата Казея і шмат іншых. Дзеці чыталі вершы «Поэзия моя, ты – у окопа», слухалі стоячы песню «Дети войны», падтрымалі хвіліну маўчання. Заканчэннем мерапрыемства стала віншаванне на даму вязня канцлагера часоў Вялікай Айчыннай вайны Ганны Гаўрылаўны Дземчанка.

Гарадзецкі філіял, 34 чал.

## Мерапрыемствы да Дня сям’і

**16 мая**

У бібліятэцы прайшоў вечар-сустрэча «Гукі свету, радасці, кахання», на якім прысутнічалі мнагадзетныя сем’і (Юдчыц, Ярмашэвіч, Ігнацюк, Шынкарук). Яны падзяліліся сваімі поспехамі і сакрэтамі шчаслівай сям’і, паўдзельнічалі ў гульнях. Дзеці чыталі вершы для сваіх бацькоў і уручалі ім падарункі, зробленыя сваімі рукамі. Арганізавана выстава кніг для маладых маці.

Магдалінская ПБ, 19 чал.

**17 мая**

Майскае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце вуснага часопіса «Сямейны партрэт». Паэты чыталі свае вершы пра бацькоў, дзяцей, бабуль і дзядуляў, унукаў, сясцёр, братоў, свякруху і свёкра, нявестак і іншых сваякоў, а таксама ў цэлым пра сям'ю і бацькоўскую хату. Разыначкай сустрэчы сталі песні Сяргея Марозава пад баян у выкананні аўтара. Не абышлося і без «праверкі» дамашняга задання: прысутныя чыталі вершы, у якіх раскрываўся сэнс вядомых выслоўяў.

Узнагароджана Алена Котава, якая заняла 3 месца ў намінацыі «Лучший поэтический перевод на русский язык» у міжнародным конкурсе перакладчыкаў «Леся Украинка о единстве народов и судеб».

ЦБ, 24 чал.

**15 мая**

Падчас конкурсна-гульнявой праграмы «Островок семейных ценностей» пагаварылі пра гісторыю свята, пра яго значэнне ў жыцці кожнай сям’і, даведаліся пра сямейныя каштоўнасці і традыцыі, успомнілі вершы і апавяданні пра сям’ю, адгадалі прыказкі і загадкі пра сяброў сям’і і казкі, у якіх галоўныя героі звязаны сямейнымі вузамі. Прагледзелі мультыплікацыйны фільм «Асцярожна, мавпачкі». Прынялі ўдзел у гульні «Перадай сэрцайка», у завяршэнне мерапрыемства пабудавалі дом сваёй мары з цаглінак з галоўнымі словамі, з якіх складаецца сямейнае шчасце (слова РАЗУМЕННЕ). Арганізавана кніжная выстава «Бібліятэка для сям’і».

Стрыгаўская ПБ, 35 чал.

**<u>Мерапрыемствы да Міжнароднага дня без тытуню</u>**

**12 мая**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры бібліятэкі прайшоў вусны часопіс «Жизнь без сигаретного дыма». Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа.

Вядучыя пазнаёмілі прысутных з гісторыяй з'яўлення тытуню і шкоднай звычкі тытунекурэння ў розныя гады ў розных краінах, аб уздзеянні электронных цыгарэт на здароўе чалавека. Урач-нарколаг Кобрынскай ЦРБ Аліна Старадубцава распавяла пра страшныя наступствы уздзеяння нікаціну на арганізм чалавека, асабліва падлеткаў. Расказ суправаджаўся мультымедыйнай прэзентацыяй аб псіхалагічнай залежнасці ад нікаціну «Курэнне. Чалавек. Здароўе».

ЦБ, 35 чал.

**28 мая**

Для навучэнцаў Лукскай СШ адбыўся ўрок здароўя «Кніга і газета замест цыгарэты». Прысутныя праслухалі інфармацыю пра сітуацыю па Брэсцкай вобласці ў фактах і лічбах, пра шкодны ўплыў тытуню і спайсаў на

арганізм, адказалі на пытанні тэматычнай віктарыны, прагледзелі відэапрэзентацыю «Курение или здоровье – всё в ваших руках!». Усім дзецям бібліятэкар раздала буклеты «Аб шкодзе курэння».

Лукская ПБ, 27 чал.

**29 мая**

Гасцямі гутаркі-роздуму «Сделай правильный выбор» сталі навучэнцы Астроміцкай СШ. Падлеткі даведаліся аб праблеме курэння і згубным уплыве розных кампанентаў тытуню і тытунёвага дыму на арганізм чалавека, ацанілі шкоду электронных цыгарэт і адказалі на пытанні віктарыны «Небяспечнае захапленне». Мерапрыемства суправаджалася паказам відэафільму «Конвейер смерти. Мир без никотина».

Астроміцкая ПБ, 17 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81